У БАЯХ І Ў ПРАЦЫ ГЕРОЙ

У АСЕННІ ДЗЕНЬ 1945 года на станцыі Глыбокае сышоў з поезда высокі, падцягнуты старшы сяржант. На яго грудзях зззялі два ордэны Славы, два ордэны Чырвонай Зоркі і некалькі медаляў. З вайны ў родныя мясціны вяртаўся салдат Леанід Канстанцінавіч Пугаўка. Ён ішоў і з болем глядзеў на зруйнаваныя вёскі і хутары.

Падцягнуўшы паўпусты рэчавы мяшок, Леанід паскорыў хаду. Пяць год не было салдата дома, і ён спяшаўся да родных і блізкіх. У думках, нібы на экране, мільгалі пражытыя гады, прэйдзены нялёгкі шлях.

Нарадзіўся ён у невялікай вёсцы Паўлава ў 1917 годзе. Многа такіх падобных адна на адну вёсак было раскідана па наваколлі. Пахілыя скасабочаныя хацінкі, саламяныя дахі. Бацькі Леанід не памятаў. Ён памёр ад туберкулёзу, пакінуўшы маці з двума дзецьмі. Старэйшаму брату Васілю ішоў тады сёмы год, а Леаніду было толькі тры. Рана пазнаў ён нястачу, холад, знявагу. Маці, каб пракарміць дзяцей, даводзілася ад зары да зары гнуць спіну на палях пана Чарняўскага, мясцовых кулакоў.

З сямі год Лёня пайшоў на заработкі. У дождж і сцюжу ён разам з братам пасвіў панскую жывёлу. Заработкі хлопчыкі мала, затое не раз па іх спінах гуллі бізуны панскіх наглядчыкаў і стражнікаў.

Леанід рана адчуў няроўнасць, нацыянальны прыгнёт. Польскія паны душылі роднае беларускае слова. У краі амаль не было беларускіх школ, кніг, газет на роднай мове. У вёсках не было урачоў, акушэрак, радзільных дамоў. Частыя эпідэміі, туберкулёз уносілі тысячы жыццяў. Людзі жылі ў галечы, марачы аб зямлі, хлебе, свабодзе і шчасці.

Шчасце прыйшло ў Заходнюю Беларусь у верасні 1939 года. З чырвоным сцягам у руках сустракаў Леанід разам з аднасяльчанамі Чырвоную Армію—вызваліцельніцу.

Новае жыццё трэба было абараняць. І восенню 1940 года Леанід Пугаўка з радасцю пайшоў служыць у рады Чырвонай Арміі. Быў пад Ленінградам у войсках процілаветранай абароны. Служыў старанна, пазнаваў ваенную навуку, палітграмату, зводаў моцную воінскую дружбу, не расставаўся з кнігамі.

...Сігнал трывогі разбудзіў Леаніда на досвітку. Фашысцкія драпежнікі рваліся да Ленінграда.

Трывожныя дні перажываў горад Леніна. Фашысты падыходзілі да яго варот. У гэтыя дні яфрэйтар Пугаўка стаў сапёрам. Пад агнём і бамбёжкай ён будаваў умацаванні, капаў траншэі, процітанкавыя равы, ставіў міны, дротавыя агарожы, узрываў масты.

Першая блакадная зіма ў асаджаным Ленінградзе. Метадычна, праз роўныя прамежкі, ірвуцца снарады, «юнкерсы» скідваюць свой смяротны груз. У горадзе няма паліва, холад, голад... Сапёры аддзялення малодшага сяржанта Пугаўкі ляжаць у траншэях разам з пяхотай. Восем атак адбіта за дзень.

Настаў час, калі савецкія воіны пачалі рыхтавацца да прарыву блакады. Яшчэ да пачатку артылерыйскай падрыхтоўкі сапёры зрабілі праходы. Неўзабаве грукат соцень гармат, успышкі «Кацюш» узарвалі цішыню. У праходы цераз Няву рынулася пяхота. У рэкордны тэрмін, пад артылерыйскім і кулямётным агнём была пабудавана 1200-метровая пераправа. Аслабеўшыя сапёры ўкладвалі 6-метровыя тоўстыя бярвенні, нарошчвалі лёд, укладвалі на бярвенні шчыты. Па гэтай своеасаблівай дарозе пайшлі ў прарыў савецкія танкі. Блакада была прарвана.

Сотні кіламетраў прайшло з баямі аддзяленне Пугаўкі, ліквідуючы мінныя загароды, дапамагаючы войскам пераадольваць перашкоды. Леанід Пугаўка быў прыкладам адвагі, вынослівасці, працавітасці. Ніхто не мог лепш за яго ўстанавіць міну, падпаўзці да дротавых агарож і нажніцамі зрабіць у іх праходы, разміраваць небяспечныя ўчасткі.

Летам 1943 года Леанід Пугаўка ваяваў на Курскай дузе. Адступаючы, фашысты густа ўсеялі мінамі палі, дарогі, замініравалі школы, бальніцы, грамадскія будынкі. Леанід са сваімі байцамі ачышчаў гарады і сёлы ад смяротных варожых «падарункаў», пакідаючы кароткі запіс: «Праверана, мін нямa! Пугаўка».

Дарогі вайны прывялі Пугаўку ў Карпаты. Неяк на досвітку два аддзяленні сапёраў пад яго камандаваннем знялі пад агнём ворага шэсць радоў дротавых агарож. За гэта ён быў узнагароджан ордэнам Чырвонай Зоркі. Тады ж быў ранен. Але вельмі хутка вярнуўся ў строй.

Аб выключнай адвазе Леаніда Пугаўкі пісалі франтавыя газеты. Яго ўзнагародзілі яшчэ некалькімі ордэнамі і медалямі.

Прайшоўшы тысячы ваенных кіламетраў, вярнуўся салдат у родныя мясціны. Назаўтра ж прыйшоў франтавік у райком партыі. Яго накіравалі на пасаду загадчыка сельскай хаты-чытальні. Ён працаваў шчыра, самаадданa. Хутка яго выбралі старшынёй сельсавета.

Гэта было ў перыяд калектывізацыі і барацьбы з кулацтвам у заходніх абласцях Беларусі. З досвітку да позняй ночы старшыня сярод сялян. Ведаючы добра іх жыццё і патрэбы, ён задушэўна гутарыў з імі, клікаў да новага жыцця. Яму верылі, за ім ішлі. Яму пагражалі кулакі, у яго стралялі бандыты. Але такіх, як Пугаўка, не запалохаеш. За выдатную арганізатарскую работу Леанід Канстанцінавіч быў узнагароджан ордэнам Леніна. У 1951 годзе працаўнікі калгаса «17 верасня» Глыбоцкага раёна выбралі Л. К. Пугаўку старшынёй праўлення.



У першую ноч новы старшыня не мог заснуць. З чаго пачынаць? У калгасе не было грамадскіх пабудоў, ні адной машыны, налічвалася ўсяго 7 кароў, адсутнічаў сельскагаспадарчы інвентар. Ускалыхнуць людзей, пераадолець іх пасіўнасць, арганізаваць актыў, падабраць кадры брыгадзіраў, кладаўшчыкоў, зацікавіць калгаснікаў матэрыяльна — з'вырашэння гэтых праблем пачаў ён сваю дзейнасць. На шляху сустракаліся велізарныя цяжкасці, перашкоды. Але надзейна абапіраючыся на актыў, Леанід Канстанцінавіч дабіўся іх пераадолення.

Увосень 1951 года быў сабран першы добры ўраджай, бо глебу ўгноілі і апрацавалі значна лепш, чым ва ўсе папярэднія гады.

Шлях да поспехаў ляжаў цераз сэрцы калгаснікаў. Старшыня знаходзіў для кожнага добрае задушэўнае слова, праяўляў бацькоўскія клопаты аб сумленных працаўніках. Але ён быў непрымірымым да абібокаў, п'яніц і хапуг.

Год за годам расла і мацнела гаспадарка, раслі даходы калгаснікаў. У 1956 годзе працаўнікі арцелі сабралі ў сярэднім з гектара 21,5 цэнтнера збожжавых, у 1957 — 23,5 цэнтнера, у засушлівым 1959 — 19 цэнтнераў і ў 1961 годзе — 25 цэнтнераў з гектара. За апошнія дзесяць год сярэдняя ўраджайнасць склала па калгасу 19,5 цэнтнера збожжавых. За кароткі час грашовыя даходы арцелі ўзраслі амаль у дзесяць разоў.

У 1958 годзе за поспехі ў калгасным будаўніцтве Леаніду Канстанцінавічу Пугаўку было прысвоена высокае званне Героя Сацыялістычнай Працы. З таго часу поспехі калгаса памножыліся. Пяць разоў ён быў удзельнікам Усесаюзнай выстаўкі дасягненняў народнай гаспадаркі. Старшыня ўзнагароджан Вялікім залатым, Малым залатым, сярэбраным і двума бронзавымі медалямі.

Шчодрым быў для арцелі мінулы год. На круг з гектара сабрана па 20 цэнтнераў збожжа, 174 цэнтнеры бульбы, па 5,2 цэнтнера льнасемя і валакна. Грашовы даход калгаса склаў 685 тысяч рублёў. На працадзень хлебаробы атрымалі па 1,8 кілаграма збожжа, 1,5 бульбы і 1,5 рубля грашыма.

Лічбы, лічбы, лічбы. За імі стаіць велізарная стваральная праца калгаснікаў і іх важака. За гэтыя гады пераўтварыўся калгас, змяніліся калгасныя пасёлкі, выраслі людзі. Закончана ссяленне з хутароў. Калгаснікі жывуць у дабротных дамах, у якіх ярка зззяюць лямпачкі Ільіча. У многіх — газавыя пліты, свецяцца блакітныя экраны тэлевізараў, ёсць матацыклы, пральныя машыны і інш. У калгасе два клубы, 2 бібліятэкі, фельчарскі ўчастак. Рэгулярна дэманструюцца кінафільмы, выступаюць артысты, арганізавана ўласная самадзейнасць.

Беларускі хлапец Пугаўка ва ўсёй Глыбоцкай акрузе раней не бачыў беларускіх школ. Цяпер толькі ў адным калгасе «17 верасня» ёсць тры школы, у якіх дзеці вучацца на роднай мове. Сыны і дочкі калгаснікаў займаюцца ў тэхнікумах, вышэйшых навучальных установах, а потым вяртаюцца ў родны калгас.

У арцелі вядзецца вялікае будаўніцтва: уся жывёла знаходзіцца ў цёплых тыпавых памяшканнях, устаноўлены падвесныя дарогі, у кароўніках абсталявана аўтапаенне. Цяпер будуецца тыпавая бальніца. Калі ў 1951 годзе ў арцелі не было ніводнай аўтамашыны, то цяпер іх 22. На палях працуюць 23 трактары.

Працаўнікі калгаса імкнуцца ў самы бліжэйшы час дагнаць па ўсіх паказчыках праслаўлены калгас «Рассвет» Магілёўскай вобласці.

Леанід Канстанцінавіч вядзе вялікую грамадскую работу. Ён з'яўляецца членам рэспубліканскага камітэта народнага кантролю.

Так радавы савецкі воін вырас да кіраўніка аднаго з перадавых калгасаў рэспублікі. Адважны і мужны ў баі, Леанід Канстанцінавіч і ў мірны час ідзе ў першых радах змагароў за народнае шчасце.

А. ТАРЛЕР.